УДК 82.09

А. А. Карп, мл. науч. сотр. (НАН Беларусі, г. Мінск)

# ПРАБЛЕМЫ ВЫДАВЕЦКАЙ СПРАВЫ ПЕРЫЯДУ АДРАДЖЭННЯ Ў ЛІТАРАТУРНАЙ КРЫТЫЦЫ СЯРГЕЯ ПАЛУЯНА

Уся разнапланавая дзейнасць Сяргея Палуяна была падпарадкаваная інтарэсам нацыянальнага адраджэння. У гэты перыяд асабліва актуальнымі былі асветніцкія задачы: праз пашырэнне культуры, навукі выхаваць адукаваных нацыянальна свядомых грамадзян.

Пры адсутнасці неабходных культурных інстытутаў асабліва вырастала роля выдавецкай справы, якая, аднак, існавала ў дастаткова абмежаваных умовах. Не хапала тэхнічных, фінансавых рэсурсаў; акрамя таго, пэўныя абмежаванні задаваліся ўзроўнем аўдыторыі. “Наша ніва” адпачатку арыентавалася на сялянства, аднак наспела неабходнасць працаваць і з нацыянальна свядомай інтэлігенцыяй. Спалучаць інтарэсы вельмі розных па сваім узроўні і патрэбах аўдыторый было вымушанай мерай.

Такі стан выдавецкай справы адбіваўся таксама і на літаратуры. Гэта бачылася сур’ёзнай праблемай, бо літаратура ў перыяд адраджэння ўмацоўвала нацыянальную ідэнтычнасць, падымала прэстыж нацыі ў свеце. Каб годна выконваць гэтыя задачы і ўвайсці ў сусветны кантэкст, яна мусіла няспынна развівацца і павышаць свой мастацкі ўзровень.

Патрабаванні С. Палуяна да літаратуры былі дастаткова высокімі, яго крытычныя канцэпцыі, крытэрыі ацэнкі ў многім супадалі з выказанымі калегамі. Адметнасцю яго крытычнай практыкі было тое, што ў лік адрасатаў крытыкі ўключаліся не толькі чытачы і аўтары, але і выдаўцы. На іх ускладалася адказнасць за адбор якасных тэкстаў, якасны друк для іх, а глабальна – за мадэрнізацыю беларускай літаратуры, яе тэматычнае і стылістычнае абнаўленне.

С. Палуян неаднаразова падкрэсліваў неабходнасць разумнай выдавецкай палітыкі, пры гэтым імкнуўся ўлічваць функцыянаванне рынку, праводзіў аналітычную працу, меў на ўвазе патрабаванні аўдыторыі, тэхнічныя, фінансавыя магчымасці, канкурэнцыю, што выглядае дастаткова нестандартнай крытычнай стратэгіяй.

Паміж выдавецкай справай, развіццём літаратуры і станаўленнем нацыі існавала непасрэдная лагічная сувязь, праца на гэтай ніве, відавочна, успрымалася С. Палуянам як агульная справа, у якой кожны далучаны мусіць праявіць адказнасць.